ДЗВІНСКІ ЎЗГОРАК

*Кроч на свой родны,
дзвінскі ўзгорак,
каб глядзець
у будучую сінь*

ГРАМАДСКА-ПАЛІТЫЧНАЯ ГАЗЕТА ВІЦЕБСКАГА РАЁНА, №2 (162)
СТУДЗЕНЬ 2023 ГОДА

МАЁМАСЦЬ

ПРАПАНУЮЦЬ НАБЫЦЬ АКЦЫІ

Акцыі 34 прадпрыемстваў Віцебскай вобласці прапануюцца да продажу ў 2023 годзе. Камітэтам "Віцебскаблмаёмасць" вызначаны пералік акцыянерных таварыстваў, якія належаць Віцебскай вобласці акцыі якіх прапануюцца да продажу ў 2023 годзе.

У параўнанні з мінулым годам гэты пералік папоўніўся 5 новымі прадпрыемствамі: ААТ "Віцебскаблаўтатранс", ААТ "Цеплаэнергетык, г.Віцебск", ААТ "Віцебскі завод радыёдэталяў "Маналіт", ААТ "Віцебскмясамалпрам", ААТ "Віцебскаблаграпрамтранс".

З 34 прапанаваных прадпрыемстваў - 25 працуюць рэнтабельна, скончыўшы мінулы год з прыбыткам, і стабільна выплачваюць дывідэнды.

Найбольш высокія дывідэнды выплацілі ў мінулым годзе такія прадпрыемствы, як "Віцебскі маторарамонтны завод", "Завод Эвістар", "Заходне-Дзвінскі міжрайагратэхсэрвіс".

У першым квартале 2023 года камітэт плануе выставіць на аўкцыён пакеты акцый ААТ "Завод Этон" і ААТ "Аўтамабільная транспартна-экспедыцыйная кампанія, г.Віцебск".

Пры гэтым трэба адзначыць, што акцыі 12 прадпрыемстваў на тэрыторыі Віцебскай вобласці могуць быць абменены на чэкі "Маёмасць", якія ёсць у грамадзян. Сярод іх найбольш прывабнымі могуць быць акцыі ААТ "Віцебскі маторарамонтны завод", ААТ "Аўтатранспартнае прадпрыемства № 4, г. Віцебск", ААТ "Цірaспальская перасовачная механізаваная калона".

Камітэт "Віцебскаблмаёмасць" нагадвае, што тэрмін абарачэння чэкаў "Маёмасць" прадоўжаны па 31 снежня 2025 года.

Зацікаўленым у набыцці акцый, або для атрымання больш падрабязнай інфармацыі, трэба звяртацца ў аддзел уладальніцкага нагляду і распараджэння акцыямі камітэта «Віцебскаблмаёмасць» (тэл. +375(212)-65-34-50).

Інфармацыі ў адкрытых крыніцах аб памеры налічаных і выплачаных дэвідэнтаў на адну акцыю па 2022 годзе пакуль няма, а ў 2021 годзе, напрыклад, "Эвістарам" на выплату дывідэндаў было налічана ўсяго 106330 рублёў, а фактычна выплачана 82230 рублёў, што склала 4 рублі на адну звычайную акцыю.

Так што інвестарам варта 100500 разоў падумаць аб неабходнасці ўкладваць свабодныя грашовыя сродкі ў акцыі з незразумелай прыбытковасцю або камітэт "Віцебскаблмаёмасць" размяшчае прапанову з загадзя вядомым вынікам?

А.Адамаў

РЭКАНСТРУКЦЫЯ

БУДЕТ РЕМОНТ, НО НЕ У НАС

Всего в соответствии с госпрограммой в 2023 году в Беларуси планируется выполнить ремонт и реконструкцию порядка 1 тыс. км республиканских дорог и 3800 пог. м дорожных сооружений. Местных дорог будет отремонтировано 1 413 км.

Какие дороги и мосты будут отремонтированы в Беларуси в 2023 году, рассказали в Министерстве транспорта и коммуникаций Республики Беларусь.

В Витебской области самым значительным будет (если найдутся финансы) реконструкция автодороги Р-46 Лепель – Полоцк – граница России (Юховичи).

Будут отремонтированы еще несколько участков республиканских дорог, в том числе на Р-53 Слобода – Новосады, где в настоящее время ведутся работы. Кроме того, прорабатывается вопрос реконструкции участка автодороги М-3 от Логойска до Плещениц.

Запланирован ремонт 37 мостов на дорогах республиканского значения, в том числе:

- моста через Припять на автодороге Р-131 Калинковичи-Мозырь протяженностью более 900 метров;
- моста через реку Ошмянка на автодороге М-7/Е28 Минск-Ошмяны-граница Литвы (Каменный Лог);
- путепровода через ж/д на дороге Р-2 Столбцы-Ивацевичи-Кобрин;
- путепровода на автодороге М-10 граница России (Селище) – Гомель – Кобрин;
- моста через реку Свечанка на автодороге М-3 Минск – Витебск.

Пока ещё не известно, будут ли в этом году улучшены дороги в Витебском районе, некоторые из них, в том числе важная для района дорога Витебск-Сураж, находятся в неудовлетворительном состоянии. Жители-автомобилисты Вымно, Янович, Зароново и многих других населённых пунктов смогут добавить своих несколько нелицеприяных пожеланий дорожникам при описании местных дорог.

А.Смоленский

Чытайце сайт Віцебскага раёна:
http://vicebskreg.by

БЯСПЕКА

ВЫНІКОВАЯ НАРАДА Ў РАЎС

У Віцебскім РАУС падвялі вынікі і ўзнагародзілі найлепшых супрацоўнікаў. А таксама падвялі вынікі працы аддзела за мінулы год.

На нарадзе АУС Віцебскага райвыканкама абмеркавалі пытанні эфектыўнасці аператыўна-службовай дзейнасці ў 2022 годзе, меры па ўмацаванні правапарадку і грамадскай бяспекі.

Прынятыя супрацоўнікамі РАУС меры дазволілі ў 2022 годзе гарантаваць грамадскую бяспеку і правапарадак на тэрыторыі Віцебскага раёна. Знізілася колькасць цяжкіх і асабліва цяжкіх злачынстваў па лініі ўсіх службаў, а таксама па накіраванні дзейнасці крымінальнага вышуку. Тое ж адносіцца і да злачынстваў, учыненых у стане алкагольнага ап'янення, у грамадскіх месцах і асобамі, якія маюць судзімасць. Раскрывальнасць склала 64%. Была праведзена прафілактыка кібер-злачынстваў, прыняты меры па іх раскрыцці.

Аднак адзначаны рост агульнай колькасці зарэгістраваных злачынстваў, у асноўным крадзяжы, махлярствы і рабаванні. Значны ўплыў на аператыўную абстаноўку аказаў новы від злачынстваў — махлярства, учыненае з выкарыстаннем сродкаў тэлефаніі і інтэрнэт-рэсурсаў. Вырасла колькасць без вестак зніклых грамадзян, больш улічана крымінальна караемых дзеянняў у сферы барацьбы з карупцыяй і эканамічнымі злачынствамі, павялічылася колькасць выяўленых асоб, якія маюць дачыненне да іх. Адной з праблем, якія патрабуюць падвышанай увагі, з'яўляецца забеспячэнне бяспекі дарожнага руху.

- Значны рост колькасці здарэнняў здарыўся ў сувязі з рэзанансным ДТЗ на 101 кіламетры аўтадарогі М8 Віцебск-Гомель. Тут велікагрузны аўтамабіль з цыстэрнай бензіну ўчыніў наезд на грузавік з ваеннаслужачымі, які стаяў. У асноўным ДТЗ адбываюцца менавіта на рэспубліканскіх дарогах, аварый на мясцовых дарогах практычна не здараецца, - растлумачыў начальнік аддзела ДАІ Віцебскага РАУС Аляксей Кузьмін. - Зыходзячы з гэтага, асноўны ўпор у прафілактыцы ДТЗ мы зробім менавіта на дарозе М8: выкарыстоўваем схаваны кантроль, дзякуючы якому выявілі больш за тысячу правапарушэнняў. Таксама ў аварыйных месцах будуць выстаўлены мабільныя датчыкі кантролю хуткасці. У цёмны час сутак мы павялічым шчыльнасць убораў у транзітных раёнах - будуць створаны змешаныя нарады: участковы інспектар міліцыі і супрацоўнік ДАІ, якія будуць працаваць у перадвыхадныя і выходныя дні.

Як адзначыў кіраўнік АУС райвыканкама палкоўнік міліцыі Аляксандр Рыбакоў, неабходна засяродзіць увагу на павышэнні эфектыўнасці работы па ўстанаўленні асоб, якія ўчыняюць злачынствы па лініі крымінальнага вышуку, кібер-злачынстваў і махлярства ў сетцы інтэрнет. Начальнік АУС Аляксандр Рыбакоў таксама параіў участковым і оперупаўнаважаным крымінальнага вышуку больш узаемадзейнічаць паміж сабой. Недагляды і недахопы ў працы былі прааналізаваны, вызначаны шляхі і мерапрыемствы па іх ухіленні.

Старшыня Віцебскага райвыканкама Генадзь Сабыніч нацэліў супрацоўнікаў РАУС на забеспячэнне грамадскай бяспекі, прафілактыку правапарушэнняў, у тым ліку ўчыненых у стане алкагольнага ап'янення, а таксама на эфектыўнасць раскрыцця злачынстваў.

Лепшым супрацоўнікам АУС кіраўнік раённага выканаўчага камітэта Генадзь Сабыніч уручыў ганаровыя граматы і падзякі. Таксама тром работнікам загадам УУС Віцебскага аблвыканкама было прысвоена чарговае спецыяльнае званне "старэйшы лейтэнант міліцыі".

Намеснік начальніка міліцыі грамадскай бяспекі УУС палкоўнік Максім Марчанка ўзнагародзіў нагрудным знакам адрознення УУС аблвыканкама аднаго з маёраў міліцыі, а таксама ўручыў ганаровыя граматы і падзякі супрацоўнікам, якія вызначыліся.

**«Віцьбічы»
Ксенія ШЫЛЕЦ**

АКТЫВІЗМ

В ПОМОЩЬ СЕНЬОРАМ

Новая форма работы — колл-центр — будет внедрена в этом году активом Витебской районной организации Белорусского общественного объединения ветеранов.



Ежедневно каждый из 16 председателей ветеранских первичек этой организации будет обзванивать по пятьшесть ветеранов Великой Отечественной войны, ветеранов труда и одиноко проживающих пожилых граждан, чтобы узнать о волнующих их вопросах, а затем в случае необходимости содействовать в оказании своевременной помощи. Об этом на заседании президиума районной ветеранской организации сообщила ее председатель Нина Козлова.

В 2022 году, который был объявлен Годом исторической памяти, основное внимание организация ветеранов уделяла социальной защите лиц пожилого возраста, передаче молодежи лучших традиций нашего общества, увековечению памяти защитников Отечества и жертв войны. Продолжится работа по этим и многим другим направлениям в тесном взаимодействии с постоянными партнерами — ТЦСОНом Витебского района, Красным Крестом, БРСМ — и в Год мира и созидания. В перспективных планах — реализация интересных задумок и креативных идей, участие в торжественных акциях, приуроченных ко Дню Победы, а также открытых шахматных темпо-турнирах, посвященных Героям Советского Союза и знаменитым личностям Витебского края. Стартовать, по словам Нины Козловой, решено с проведения уже в ближайшие месяцы конкурса «Бабушкин пирог». В его рамках в каждом сельсовете района активисты ветеранского движения будут сами удивлять своими кулинарными способностями, готовя вкуснейшие пироги, возможно и по уникальным рецептам, бережно передающимся из поколения в поколение, и приобщать к этому всех желающих. Такое душевное мероприятие, уверены ветераны-активисты, вызовет отклик у людей. Ожидается, что к нему охотно подключатся работники сельских клубов и библиотек, отделений дневного пребывания для граждан пожилого возраста Витебского ТЦСОНа, школьники.

Прорабатывается ветеранским активом вопрос изготовления и установки мемориальной доски в агрогородке Бабиничи воину-интернационалисту, летчику-оператору вертолета, погибшему при исполнении боевого задания в Афганистане, Сергею Ерохе.

Впервые на заседании президиума определили лучшего председателя ветеранской первички. Из 16 кандидатов этого звания удостоена Людмила Никитина из агрогородка Зароново, вклад которой в патриотическое воспитание подрастающего поколения, сохранение историко-культурных ценностей Придвинья и поисковое движение неоценим. Сейчас Людмила Никитина работает над совместным проектом с филиалом «Центр национальных культур» ЦК «Витебск». В его рамках на протяжении каждой поры года будут отмечать белорусские народные праздники и проводить обряды, знакомя с ними иностранцев и своих земляков. Так, 13 января в Зароново для группы китайских студентов состоялся обряд колядования, а 20-го числа его повторят уже для студентов из Индии.

Приятным моментом на встрече ветеранского актива района стало поздравление с 75-летним юбилеем Василия Колесника, возглавляющего ветеранскую первичку Октябрьского сельисполкома.

В Витебском районе проживает 11 ветеранов Великой Отечественной войны, 184 бывших узника концлагерей, 369 одиноких пожилых людей. Всего же в населенных пунктах региона насчитывается 7950 пожилых людей. Никто из них не будет оставлен без должного внимания.

Фото: Нина Козлова поблагодарила Людмилу Никитину за активную позицию и большой вклад в ветеранское движение.

«Витьбичи»
Светлана ЛЮБОЧКА

ЗДАРЭННІ

ИЩУТ ОЧЕВИДЦЕВ ДТП

Жителей Витебской области, которые стали свидетелями ДТП или располагают записями с видеорегистраторов, просят помочь в установлении обстоятельств пяти дорожно-транспортных происшествий. Об этом сообщила официальный представитель УСК по Витебской области Оксана ЛАЗЬКО.

7 октября 2022 года 29-летняя женщина, управляя автомобилем GEELY GEOMETRY, двигалась по проспекту Московскому в Витебске. Около 15.17 при пересечении перекрестка «проспект Московский — улица Баграмяна» на разрешающий сигнал светофора, совер-шила столкновение с завершающим движение через перекресток автомобилем SKODA RAPID. В результате ДТП водителю SKODA RAPID причинены тяжкие телесные повреждения.

11 октября 2022 года водитель, управляя автомобилем MAZDA PROTEGE, двигался по улице Короткевича в Витебске. Около 7.45 в районе дома № 4 по улице Богатырева совершил наезд на женщину, переходившую проезжую часть дороги по регулируемому пешеходному переходу. В результате ДТП пешеходу причинены тяжкие телесные повреждения.

13 ноября 2022 года водитель, управляя автомобилем HYUNDAI SONATA, двигался по проспекту Фрунзе в Витебске. Около 6.35 в районе дома 80/1 совершил наезд на пешехода. В результате ДТП пешеходу причинены тяжкие телесные повреждения.

8 декабря 2022 года 70-летний водитель, управляя автомобилем SAMAND LX, двигался по 93 километру дороги Р-25 «Витебск-Сенно-Толочин» по территории Толочинского района. Около 7 часов вблизи деревни Яново совершил наезд на пешехода, причинив ему тяжкие телесные повреждения.

9 декабря 2022 года 30-летний водитель, управляя автомобилем VOLKSWAGEN CADDY, двигался по 21 километру автодороги Р-20 «Витебск-Полоцк-граница Латвии», по территории Витебского района. Около 19.00 при совершении обгона выехал на полосу встречного движения, где столкнулся с автопоездом в составе тягача MAN в сцепке с полуприцепом. После чего автомобиль VOLKSWAGEN CADDY отбросило на другую полосу движения, где он столкнулся с автопоездом в составе тягача SKANIA в сцепке с полуприцепом. В результате ДТП водитель легкового автомобиля погиб на месте происшествия.

С целью установления обстоятельств аварий, следователи обращаются с просьбой к гражданам, которые стали свидетелями ДТП или располагают записями с видеорегистраторов, сообщить об этом по телефону оперативно-дежурной службы УСК по Витебской области +375 (33) 399-80-44 (круглосуточно).

А.Адамов

СЕЛЬСКАЯ ГАСПАДАРКА

ЯК СПРАВЫ Ў ЖЫВЁЛАГАДОЎЛІ?

Поспехі і недахопы ў жывёлагадоўлі абмеркавалі на паседжанні ў Віцебскім райвыканкаме.

У перыяд санкцыйнага ціску, які аказваецца на краіну, аграрыям важна гарантаваць харчовую бяспеку, падкрэсліў кіраўнік Віцебскага раёна Генадзь Сабыніч, звяртаючыся да ўдзельнікаў калегіі ўпраўлення па сельскай гаспадарцы і харчавання Віцебскага райвыканкама. Для гэтага трэба зараз добрасумленна працаваць па ўсіх напрамках. Рыхтаваць насенне, сельгастэхніку да веснавых палявых работ. Не менш адказны перыяд і для зімова-стойлавага ўтрымання жывёлы.

На 1 студзеня 2023 года колькасць буйной рагатай жывёлы ў Віцебскім раёне склала каля 50 тысяч галоў.

Па выніках працы за студзень - снежань 2022 года валавая вытворчасць малака дасягнула амаль 89 тысяч тон, або 102,8 працэнта да аналагічнага перыяду 2021 года.

Сярэдні надой на адну галаву за год склаў звыш 6,5 тысячы кілаграмаў, гэта на 200 кілаграмаў больш за леташні вынік.

Праводзіць кантрольныя дойкі, арганізоўваць градацыйнае кармленне, ажыццяўляць кантроль за раздачай канцэнтратаў, асаблівую ўвагу ўдзяляць жывёле, арганізоўваць і кантраляваць раздой — гэта работа павінна быць пастаяннай і бесперабойнай, запатрабаваў старшыня райвыканкама.

Сярэднясутачныя прыбаўленні ў вазе жывёлы ў студзені — снежні мінулага года па раёне склалі 611 грамаў.

Кіраўнік раёна акцэнтаваў увагу на яшчэ адным важным аспекце - захаванасці жывёлы. Асаблівая ўвага ў тэарэтычнай частцы пасяджэння калегіі надавалася пытанням здароўя жывёл, недапушчэнню склону, тэхналагічным стратам, абнасельванню кароў і цялушак пад атэлі на 2023 год. Для гэтага неабходны правільны догляд, кармленне, уцяпленне памяшканняў для жывёлы.

Цяпер перыяд масавых атэлаў. Для здаровых цялят на кожнай ферме павінен быць банк малодзіва.

Аб гэтым гаварылі і на выязной частцы калегіі. Яркі прыклад добрай працы ветэрынарнай службы з навацельнай жывёлай паказалі на малочнатаварнай ферме «Падбярэззе» вытворчага кааператыва «Альгоўскае». Там каля 200 здаровых цялят ад 0 да 2 месяцаў жывуць у індывідуальных хатках і загончыках прафілакторыя.

Пытанні застаюцца і па захаванасці маладняку. Галоўны ветурач ПК "Альгоўскае" Мікалай Шаўнёў распавёў, што дакладнае выкананне комплексу ветэрынарна-заатэхнічных мерапрыемстваў - залог здароўя цялят. Толькі выконваючы тэхналагічную дысцыпліну, санітарна-гігіенічныя патрабаванні, можна выканаць пастаўленыя задачы па нарошчванні вытворчасці малочнай і мясной прадукцыі.

Акрамя таго, удзельнікі калегіі разгледзелі пытанні падрыхтоўкі тэхнікі да веснавых палявых работ на 2023 год, графік выканання рамонтных работ за снежань мінулага года выкананы на 107 працэнтаў. Генадзь Сабыніч паставіў перад кіраўнікамі сельгаспрадпрыемстваў сур'ёзныя задачы.

- Даручэнні, якія давалі Прэзідэнт Беларусі і старшыня аблвыканкама ў мінулым годзе, аграрным сектарам раёна выкананы. Неабходна не змяншаць тэмп, а мэтанакіравана працаваць. Павінны ўтрымаць пазіцыі, якія вызначаліся па вытворчасці малака і вырошчванні буйной рагатай жывёлы, валавым прыбаўленні ў вазе. Таму кантроль будзе самы дбайны. Каб 2023 год быў паспяховым, кожнае абяцанне давядзецца падмацоўваць канкрэтнымі справамі. Наш поспех перш за ўсё залежыць ад вытворчасці прадукцыі і заработнай платы людзей, развіцця прадпрыемстваў, - нацэліў кіраўнік раёна.

«Віцьбічы»
Ірына Хасанава

НАША ГІСТОРЫЯ

ПАЎСТАННЕ КАСТУСЯ КАЛІНОЎСКАГА: ЯК ПАЧАЛОСЯ І ЧАМУ ЗГАСЛА

160 гадоў таму пачалося вызвольнае паўстанне 1863-1864 гадоў, адным з лідараў якога быў наш нацыянальны герой Кастусь Каліноўскі. Чарговая юбілейная дата — добрая нагода, каб узбагаціць веды па айчыннай гісторыі. Партал Budzma.org падрыхтаваў адмысловы гайд, у якім коратка і зразумела тлумачым, што было перадумовамі і прычынамі паўстання, як яно пачалося і чаму згасла.



Рэдкі здымак паўстанцаў 1863-1864 гг.

Што было перад паўстаннем?

Абвастрэнне сітуацыі ў беларускай вёсцы ў сувязі з адменай прыгоннага права і чаканнем сялян сапраўднай волі супала з адраджэннем нацыянальнага руху на тэрыторыях былой Рэчы Паспалітай. У 1860 годзе праходзілі народна-патрыятычныя выступленні ў розных формах: спяванне патрыятычных гімнаў у касцёлах, нашэнне элементаў патрыятычнай вопраткі такіх, як шапкі-рагулі ці канфедэраткі, зверху — чамары.

Вялікае абурэнне і сярод жыхароў Царства польскага, і сярод патрыётаў з Паўночна-Заходняга краю выклікаў расстрэл 27 лютага 1861 года патрыятычнага шэсця ў Варшаве, калі царскія жаўнеры адкрылі агонь па натоўпу. 5 чалавек былі забітыя, 10 — паранілі. Шэсце было прысвечана бойцы пад Грохавым, што адбылася 25 лютага 1831 года. Царскія жаўнеры тады пацярпелі паразу.

Як адказалі патрыёты?

Пачалі павальна насіць «жалобу» — жалобныя строі і «чорную» біжутэрыю — запанкі, кольцы, медальёны з выявамі «Белага арла», «Пагоні», якара, косаў і шабляў. У хуткім часе за такія ўпрыгожванні і вопратку людзі пачалі атрымліваць штрафы або арышт.

Гэта яшчэ больш азлобіла жыхароў акупаваных расейцамі земляў. Пачаліся адкрытыя сутычкі на вуліцах паміж маладзёнамі. Патрыёткі маглі апляваць расейца або абла-яць. Афіцэраў і жаўнераў адмаўляліся абслугоўваць у кавярнях, пакуль тыя не зробяць замову на мясцовай мове, а калі царскі жаўнер ці службовец заходзіў у касцёл, то ксёндз мог прыпыніць службу. Пачаўся распаўсюд антыцарскай літаратуры, у тым ліку славутай «Мужыцкай праўды».

Распаўсюд газеты выконваў адразу некалькі функцый. У змесце «простай мовай» тлумачыўся сялянам прыгонніцкі характар аграрнай рэформы 1861 года. Газета раскрывала імперскую палітыку самадзяржаўя і абараняла скасаваную ўладамі ўніяцкую царкву і былыя свабоды…

І яно пачалося!

Паўстанне палыхнула ў Каралеўстве Польскім ноччу з 22 на 23 студзеня 1863 года. Царскія вайсковыя гарнізоны ў розных частках краіны былі адначасова атакаваныя. Нагодай для выступу стаў чарговы рэкруцкі набор па спісах, у якія ўвайшлі ўсе «нядобранадзейныя» маладыя людзі. Але выступленне было падрыхтавана не да канца.

Спантаннае выступленне ў Польшчы стала поўнай нечаканасцю для рэвалюцыянераў Беларусі і Літвы. Але пасля ваганняў паўстанне было падтрымана імі амаль праз тыдзень. 1 лютага 1863 года Літоўскі Правінцыйны камітэт абвясціў сябе часовым губернскім урадам Літвы і Беларусі і апублікаваў праграмныя дакументы. Гэтая праграма дублявала праграму польскіх паўстанцаў…

Як ішла ўзброеная барацьба?

Першыя атрады паўстанцаў з'явіліся ў заходніх губернях Беларусі ў канцы студзеня 1863 года. У сакавіку-красавіку было сфарміравана больш за шэсць мясцовых атрадаў. Сярод іх былі дробныя шляхцічы, студэнты, рамеснікі, сяляне і афіцэры, якія пакінулі царскую армію.

Праблемай была адсутнасць агульнага плана дзеянняў і ўзаемнай каардынацыі. Зброі таксама не хапала. Паўстанцы нападалі на нешматлікія царскія патрулі, раззбройвалі мясцовых паноў, егераў, царскіх службоўцаў.

Усяго за перыяд з лютага па жнівень 1863 года у межах сучаснай Беларусі было зафіксавана 46 бітваў і сутычак паўстанцаў з царскімі войскамі. Значная колькасць з іх прыйшлася на Гродзеншчыну і Віленшчыну…

Чаму паўстанне згасла і што стала з Каліноўскім?

У чэрвені 1863 года распачаліся шматлікія арышты ўдзельнікаў паўстання. Крыло «белых» не вытрымала такога ціску. Кастусь Каліноўскі з паплечнікамі стварылі кшталту літоўска-беларускага падпольнага руху. Яго дзейнасць мусіла надаць надзеі людзям і натхніць новыя сілы на паўстанне. Але было надта позна, асейцы амаль задушылі восенню 1863 года ўзброены супраціў на беларуска-літоўскіх землях. Амаль праз год былі цалкам знішчаныя апошнія атрады паўстанцаў у Польшчы.

Кастусь Каліноўскі да апошняга адмаўляўся пакінуць спробы падняць народ на новае паўстанне. Ён спрабаваў арганізаваць новыя выступы вясной 1864 года, але малады сябар рэвалюцыйнай арганізацыі Вітольд Парфіяновіч заклаў следчым месца знаходжання і псеўданім свайго старэйшага таварыша.

Каліноўскі быў арыштаваны ў хуткім часе і публічна павешаны на плошчы Лукішкі ў Вільні. Цела яго было пахаванае на тэрыторыі вайсковага гарнізона і засыпана вапнаю. З яго смерцю згасла і апошняе буйное паўстанне на Беларусі і Літве.

(скарочана ды адрэгавана)

Алесь Масевіч
budzma.org

УЛАДА

НАЧАЛА ЛИ СИСТЕМА ПОЕДАТЬ СЕБЯ ИЗНУТРИ?

Чем можно объяснить задержания среди управленцев и силовиков? На эти и другие вопросы Филина ответил профессор писхологии Владимир Янчук: «Неуверенность в завтрашнем дне присутствует как в управленческом и силовом блоке, так и наверху».

— За последнюю неделю произошло несколько громких задержаний среди представителей властей и госпредприятий. В том числе речь идет о сотрудниках силовых структур, причастных к репрессиям. О чем это говорит: система начинает поедать своих или же речь о классическом «бей своих, чтобы чужие боялись»?

— Это и то, и другое. В принципе, система начинает давать сбои, т.к. все ее ресурсы самоподдержания исчерпаны. Более того, как бы наш «большой сосед», во мно-гом определяющий нашу внутреннюю и внешнюю политику, не раздувал щеки, ситуация у него очевидно ухудшается.

Победные же реляции становятся все менее убедительны. А перспективы становятся все более и более мрачными. Речь, правда, не о краткосрочной перспективе, хотя и она внушает мало оптимизма. А в долгосрочной становится ясно, что пошли сбои.

И когда это началось, то в чиновничьей среде появилось беспокойство. И когда завтрашний день становится все более неопределенным, это беспокойство нарастает как среди управленцев, так и в силовых структурах. Раньше можно было сбежать к соседу, а теперь это стало малопривлекательным, да и просто опасным.

Среди силовиков есть разные люди. Многие из них держат нос по ветру. Так как нет доверия никому. Так как напряжение и беспокойство растет, я в этом не сомневаюсь. Так что эта неуверенность в завтрашнем дне присутствует как в управленческом и силовом блоке, так и наверху.

Взять тот же международный уровень. Даже на уровне СНГ и постсоветского пространства мы также оказались в одиночестве. Коллеги по Содружеству стали дистанцироваться от «старшего брата» все дальше и дальше.

И что делать властям в этой ситуации? Арсенал воздействия ведь какой? Попугать, показать, что власть бдит, раздуть щеки. При этом таких заметных, которые на поверхности, «радикальных элементов» практически не осталось. Общество к задержаниям адаптировалось и очередные аресты не имеют никакого сдерживающего эффекта.

Но держать в страхе людей стало имплицитным свойством системы. К другому-то она просто не приучена. Да и не умеет. Вот поэтому система и взялась за своих. Не доверяет ведь никому. Всюду предатели видятся.

Опять же, доносы. Я не раз писал об этом: нынешняя ситуация во власти — это битие копытом ретивых, которые не гнушаются в выборе средств, чтобы прорваться наверх. Поэтому в ход идут доносы, кляузы. Сдавай своих, бей своих — чтобы чужие боялись. Ситуация предсказуемая. Но и резерв ретивых иссякает.

— Допустим, власть пытается сбить эти настроения репрессивными мерами. Но можно ли такими методами консолидировать чиновников и силовиков? Разве что демотивировать. Что в такой ситуации может чувствовать какой-нибудь высокопоставленный следователь, приложивший руку к закрытию крупного независимого портала, и вдруг оказавшийся в наручниках?

— Власть у нас специфическая, арсенал средств у нее невелик — кнут. Эти посадки способствуют не консолидации, а наоборот — нарастанию страхов в самой же системе. И, как следствие, к дистанцированию от нее. А при возможности и «сваливанию» за рубеж.

Люди не принимают решения, капсулируются, боятся друг друга. А когда они изолируются друг от друга, система начинает работать все хуже и хуже. И начинает усложняться экономическая ситуация. И когда это происходит, снова срабатывает стратегия бить своих, чтобы в этот раз они не предъявляли претензии по поводу падения благосостояния. Но общество-то к этому привыкло и в позитивные результаты подобной политики не верит.

К тому же, что бы ни говорили, одновременно идет сокращение штата на всех уровнях. И это сокращение сопровождается в том числе чисткой своих людей.

— Кто-то уходит сам, некоторые оказываются под арестом. Нередко это профессионалы своего дела. Кто приходит на их место и как качество новых управленцев сказывается на эффективности властной системы?

— Вопрос очевидный. Сказываться будет крайне скверно и разрушительно. И это результат даже не политики последних дней, а политики многолетней. Когда делается акцент на лояльности, а не на профессионализме. Раньше эта лояльность худо-бедно нивелировалась за счет дурных денег, в том числе поступающих от соседа.

А сейчас ведь и у соседа денежные проблемы, нефтегазовый поток сокращается, траты очень большие. И если раньше можно было латать дыры, не особо заботясь о принятии выверенных решений, то сейчас эта проблема обостряется.

Теперь эта непродуманная политика очень поверхностного отношения к профессионалам начинает проявляться все очевиднее. Ведь поиск новых точек сбыта, работа над новой логистикой требует высокой квалификации, а не только лояльности.

У меня первые опасения начали появляться еще лет десять назад, когда во власть и управление стали приходить троечники. Увы, теперь мы видим результат: кадров нет, резервов нет.

Так как знания и квалификация оказались на периферии, то и брать их неоткуда. Покупать специалистов мы не можем — денег нет. Да никто из разумных управленцев и не поедет сюда. Увы, за что боролись, как говорится.

gazetaby.info

АЗБУКА ПАЛІТАЛОГІІ

ЯК ВЫДАТКІ НА МАСАВЫЯ РЭПРЭСІІ ПАПАЎНЯЮЦЬ ВУП

Спробы прыстасавацца да пераменаў у тыя часы, калі ўлада распачынала ліквідацыю сваіх апанентаў, рабіліся неаднаразова, аднак усе яны кожны раз заканчваліся правалам. Сяргей Нікалюк піша ў «Новы Час» з чаго складаецца ВУП і куды мы рухаемся.



Каб нешта ацэньваць — не істотна, што ці каго, — патрэбныя нейкія крытэры. Прыгадаем, як у СССР даказвалі перавагі планавай эканомікі над рынкавай перавыкананнем планаў па выплаўцы чыгуну і сталі. А пра дасягненні ў вытворчасці канчатковых прадуктаў — у прыватнасці, легкавых аўтамабіляў — прапаганда сарамліва маўчала.

У СССР галіны прамысловасці падзяляліся на тыя, якія ствараюць сродкі вытворчасці (група «А»), і тыя, што робяць прадметы для асабістага спажывання грамадзян (група «Б»). Пры гэтым падкрэслівалася, што вытворчасць групы «А» служыць вызначальным паказчыкам эканамічнага развіцця.

Падобнае эканамічнае адкрыццё спалучалася з лозунгам партыі: «Усё ў імя чалавека, усё дзеля дабрабыту чалавека». Ніхто пры гэтым не звяртаў увагі на тое, што сродкі (група «А») ставіліся вышэй за мэту (група «Б»). І не варта гэтаму дзівіцца. Ва ўмовах масавага двудумства ў СССР падобны парадокс на фоне сваіх «калегаў» нічым прынцыпова не вылучаўся.

У гэтай сувязі прыгадваецца анекдот:

— *Мы робім самыя вялікія ў свеце экскаватары, якія крочаць!*

— *А навошта вы іх робіце?*

— *Каб здабываць больш за ўсіх у свеце жалезнай руды!*

— *Дзеля чаго?*

— *Каб выплаўляць больш за ўсіх у свеце чыгуну і сталі!*

— *А навошта?*

— *Каб рабіць самыя вялікія ў свеце экскаватары, якія крочаць!*

З чаго складаецца ВУП

І ў нашы дні не страціла сваёй актуальнасці праблема, так бы мовіць, «чым будзем мерацца?». Здавалася б, універсальных паказчыкаў ВУП на душу насельніцтва пакуль яшчэ не прыдумана. Аднак не спяшаецеся радавацца.

Растлумачу свой скептыцызм з дапамогай амерыканскага сенатара, кандыдата ў прэзідэнты 1968 года Роберта Кенэдзі: «ВУП вымярае ўсё, акрамя таго, дзеля чаго варта жыць, — наш валавы ўнутраны прадукт уключае ў сябе забруджванне паветра, рэкламу цыгарэт і машыны хуткай дапамогі, якія вязуць тых, хто пацярпеў у катастрофах. Ён улічвае і дзвярныя замкі, і турмы для людзей, якія іх узломваюць. Ён уключае ў сябе знішчэнне секвойных лясоў і ўнікальнай прыроды ў выніку хаатычнай урбанізацыі... Але ён не ўлічвае здароўе нашых дзяцей, якасць іх адукацыі і ўсмешкі на іх тварах».

Прыгожа, пагадзіцеся. А калі працей і бліжэй да родных бяроз ды асін як у прасторы, так і ў часе?

Давайце паспрабуем! ВУП Расіі знізіўся ў 2022 годзе на 2,5%. Некрытычна, калі ўлічыць, што пасля 24 лютага большасць эканамістаў ацэньвала маючы адбыцца спад двухзначным лікам. Але д'ябал, як вядома, мае звычку хавацца ў дэталях — прычым часам другасных. На адну з такіх дэталяў звярнуў маю ўвагу Telegram-канал «Кремлевский мамковед» у пасце пра тое, навошта расіяне скупляюць нерухомасць за мяжой.

Цытую: «Турцыя пацярпела ад расіян. Па выніках 2022 года яна стала сусветным лідарам па росце коштаў на арэнду нерухомасці — у параўнанні з 2021 годам жыллё падаражэла на 160,6%.

Паводле даных Propriete Generale Group, на Турцыю прыйшлося 32,8% попыту на замежную нерухомасць з боку расіян. Значную ролю ў пытанні выбару краіны для пераезду на ПМЖ адыграла магчымасць ВНЖ у Турцыі пасля куплі нерухомасці, а праз 5 гадоў — грамадзянства.

Купля нерухомасці за мяжой стала для расіян інструментам павышэння асабістай бяспекі. Толькі 14,3% здзелак былі заключаныя з мэтай атрымання даходу ад інвестыцый. 15,7% расіян набывалі кватэры і дамы за мяжой проста для ўласнага пражывання, а 64,1% — для атрымання ВНЖ. З такім падыходам вяртанне ў Расію людзей, якія набылі нерухомасць, у хуткім часе ўяўляецца вельмі малаверагодным».

Ахова грамадскага парадку і забеспячэнне бяспекі, нароўні з падтрыманнем вяршэнства закона і аховай правоў і свабодаў грамадзян належаць да базавых функцый сучаснай дзяржаў.

Расійская Федэрацыя пачала «спецаперацыю» нібыта дзеля абароны правоў і свабодаў рускіх ва ўсходніх рэгіёнах Украіны. Мэта, канешне, высакародная, а што тычыцца скарыстаных для гэтага сродкаў — тое тэма для асобнай размовы.

Дзесяць месяцаў намаганняў па дасягненні мэты абярнуліся шасцізначнай колькасцю забітых з абодвух бакоў і сямізначнай лічбай тых, хто пакінуў краіну-вызваліцельку. Вось і падлічвай пасля гэтага ВУП, істотную частку на стварэнне якога склалі выдаткі на масавыя забойствы.

У процілеглы бок ад Еўропы

Згадайцеся з трох разоў, як перажыла беларуская мадэль 2022-ы год? Песімістаў папрашу ў гэты час пайсці папаліць дзесьці ўбаку. Іх меркаванне мяне не цікавіць. Хай яны ідуць сабе маршыраваць пад «Марш энтузіястаў».

Таму дам слова старшыні Савета Рэспублікі Наталлі Качанавай: «Мы бачым, што, нягледзячы на санкцыйны ціск і праблемы, якія ёсць у плане рэалізацыі прадукцыі нашых прадпрыемстваў, эканоміка паказала вынік, заводы працавалі, заработная плата выплачвалася стабільна. Няпросты 2022 год мы пражылі вельмі годна. І гэта нягледзячы на ўсе перыпетыі, калі многія думалі, што Беларусь абрынецца. Але нічога ў нядобразычліўцаў не атрымалася. Усе нашы поспехі кажуць пра тое, што тая сістэма ўлады, тая структура, якая выбудаваная ў нашай краіне, эфектыўная».

«Заводы працавалі, заработная плата выплачвалася стабільна». Ну як тут не зняць капялюш і не схіліць калена перад сістэмай улады, выбудаванай за тры дзесяцігоддзі! «Многія думалі, што Беларусь абрынецца» — а яна не абрынулася! Вось такі сёння крытэр эфектыўнасці.

Аднак адсутнасць абвальвання эканомікі — не адзіны крытэр правільнасці абранага ўладай курсу, які вядзе ў процілеглы ад Еўропы бок. Каб зразумець, ад чаго Беларусь аддаляецца, працытую амерыканскага палітолага Дэніэла Трэйсмана: «Еўрапейская культура, з якой нарадзілася „мадэрнізацыя", узнікла з вельмі рэдкага спалучэння гістарычных абставінаў: немагчымасці для любога суб'екта ўлады (кароны, імператара, царквы, суверэнных гарадоў і іншых) ліквідаваць сваіх апанентаў, што дало штуршок да пошуку сістэм кампрамісаў...»

Можна па-рознаму ставіцца да апанентаў улады, але без іх на мадэрнізацыю разлічваць не даводзіцца. У гэтай сувязі нагадаю фрагмент з Паслання—2013 адзінага беларускага палітыка: «Наш выбар, дарэчы, невялікі. Мы можам ці прыстасавацца да бурных перамен, ці застацца на ўзбочыне гісторыі. Іншага не дадзена».

Дзесяць гадоў таму выбар у беларускай мадэлі яшчэ быў, аднак эфектыўная ўлада паставіла на ім крыж.

Сяргей Нікалюк
novychas.online

РАСІЯ

«ДАЖЕ БЛИЖАЙШИЙ СОЮЗНИК ВДРУГ ПРИЯТНО УДИВИЛСЯ, ЧТО УКРАИНА ЕМУ НЕ УГРОЖАЕТ»

За этот год российская ядерная угроза девальвировалась вместе с российскими понтами а белорусские пограничники отразили жестокий натиск украинских наступательных заборов, что Лукашенко приятно удивился...

— Как ты знаешь, я совершенно не разбираюсь в современных военных техниках. Но люди, которые разбираются, очень впечатлились новыми планами военных поставок в Украину, о которых страны НАТО объявили за последние пару дней. Там одних только бронемашин и бронетранспортеров несколько сотен. При том это ведь, как я понимаю бонусные поставки. Потому что сегодня будет новый Рамштайн, а после него, видимо, объявят об основном пакете.

Вот, поскольку второй армии мира на все эти гаубицы и ракеты не хватит, Россия ответила на западные планы залпом вербальных интервенций. Бывший президент Медведев вытащил из чулана ядерную дубинку, а патриарх, в соответствии с занимаемой должностью, вспомнил про Бога и Страшный суд. (На ПВО, даже то которое установлено на крыше министерства обороны патриарх, видимо, уже не рассчитывает).

Но оказалось, что ядерная дубинка машет, а поставки идут. Обидно же. Ты им про ядерный Армагеддон, а они обсуждают хватит ли новым танкам солярки и запчастей. А ядерного Армагеддона не обсуждают вообще. Вот хоть бы для приличия сделали вид, что боятся.

А все потому, что за этот год российская ядерная угроза девальвировалась вместе с российскими понтами. Вот российский рубль устоял, а понты не выдержали. И оказалось, что девальвация понтов для российской власти опаснее, чем девальвация рубля. Лучше бы рубль упал, чем понты.

Потому что величие России держалось не на рубле, не на нефти, не на газе и не на второй армии мира, а на понтах. А когда понты кончились даже дружественные страны начали оглядываться по сторонам в поисках спасательных шлюпок.

Сначала президент Сербии сказал, что вербовка наемников в российскую ЧВК осложняет их двусторонние отношения. Потом Иран вчера заявил, что со всем своим уважением не собирается признавать российскими Крым и Донбасс. (Про уважение это я преувеличил для риторического эффекта). А все потому, что статус главного мирового хулигана, который Россия пыталась себе присвоить, утонул вместе с российским военным кораблем.

И даже ближайший союзник, которому вроде как некуда уже деваться, вчера вдруг приятно удивился, что Украина ему не угрожает. Столько месяцев белорусские пограничники отражали жестокий натиск украинских наступательных заборов, а вчера внезапно выяснилось, что «Украина на провокации не идет», хотя ее и подталкивают.

По информации: gazetaby.info

Заснавальнік і рэдактар: Смолікаў Канстанцін Эдуардавіч

Адрас рэдакцыі: г. Віцебск, вул. 1-я Сененская д.5,
Тэл. +375-29-218-98-38, e-mail: bigsmoll2007@gmail.com
Газета выдаецца з лютага 2014 г.

Падпісана да друку 30.01.2023 у 17.40
Наклад: 290 асобнікаў.
Выдаецца адзін-два разы на месяц на беларускай і расійскай мовах.

Рэдакцыя можа друкаваць артыкулы дзеля палемікі, не падзяляючы пазіцыі аўтараў.
Друкуецца пры падтрымцы аднадумцаў.
Распаўсюджваецца бясплатна дабраахвотнікамі.